ЗАЦВЕРДЖАНА

Загад Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
20.10.2025 № 447

Праграма ўступных іспытаў
па вучэбным прадмеце «Геаграфія»
для атрымання агульнай вышэйшай
і спецыяльнай вышэйшай адукацыі,
2026 год

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма ўступных іспытаў па вучэбным прадмеце «Геаграфія» прызначана для асоб, якія паступаюць ва ўстановы вышэйшай адукацыі для атрымання агульнай вышэйшай і спецыяльнай вышэйшай адукацыі.

Структура праграмы ўступных выпрабаванняў адпавядае зместу вучэбнага прадмета «Геаграфія», прадстаўленаму ў вучэбнай праграме.

## ПАТРАБАВАННІ ДА ПАДРЫХТОЎКІ АБІТУРЫЕНТАЎ

У выніку вывучэння прад'яўлянага да засваення вучэбнага матэрыялу абітурыент павінен

ведаць / разумець:

асноўныя заканамернасці развіцця геаграфічнай абалонкі Зямлі, тэрытарыяльную арганізацыю жыцця грамадства, асаблівасці ўзаемадзеяння паміж чалавекам і прыродным асяроддзем; уклад вучоных у развіццё геаграфіі, ролю геаграфічнай навукі ў вырашэнні праблемы ўзаемадзеяння грамадства і прыроды; асаблівасці прыроды Зямлі і насельніцтва свету, узровень развіцця, спецыялізацыю і размяшчэнне галін (відаў дзейнасці) сусветнай гаспадаркі;

сучасную палітычную карту свету, асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры насельніцтва рэгіёнаў свету; прыроду мацерыкоў і акіянаў, асаблівасці дэмаграфічных працэсаў і гаспадарчай дзейнасці насельніцтва розных краін і рэгіёнаў;

месца Рэспублікі Беларусь у сусветнай супольнасці, асаблівасці прыроды, насельніцтва, гаспадаркі краіны; асноўныя этапы развіцця геаграфіі сусветнай гаспадаркі, сучасную структуру сусветнай гаспадаркі; глабальныя геаэкалагічныя і сацыяльна-эканамічныя праблемы; сутнасць праблем прыродакарыстання і стратэгіі ўстойлівага развіцця;

умець:

працаваць з картаграфічнымі матэрыяламі і іншымі крыніцамі геаграфічнай інфармацыі (графічнай, статыстычнай, даведачнай, краязнаўчай); чытаць план мясцовасці (вызначаць аб’екты па ўмоўных знаках, бакі гарызонту, азімут, абсалютную вышыню, адносную вышыню, напрамкі, адлегласці, іх узаемаразмяшчэнне); чытаць тапаграфічную і геаграфічныя карты;

вызначаць (вымяраць) адлегласці, геаграфічныя каардынаты і напрамкі, вызначаць геаграфічныя каардынаты свайго населенага пункта; апісваць раўніны і горныя краіны;

будаваць графікі ходу асноўных кліматычных паказчыкаў, ружу вятроў; аналізаваць геаграфічнае праяўленне шыротнай занальнасці па тэматычных картах; вызначаць сярэднясутачныя і сярэднямесячныя тэмпературы, змяненне тэмпературы паветра і атмасфернага ціску з вышынёй, абсалютную і адносную вільготнасць паветра; супастаўляць кліматычныя характарыстыкі; разлічваць амплітуды тэмператур, адносныя перавышэнні, змены колькасці насельніцтва з улікам натуральнага і механічнага руху, сярэднюю шчыльнасць насельніцтва па статыстычных дадзеных; вызначаць па карце глыбіню і працягласць акіянаў з захаду на ўсход і з поўначы на поўдзень; складаць апісанне прыроды і рэсурсаў акіянаў, складаць схему структуры гаспадаркі, галін прамысловасці (відаў дзейнасці), сельскай гаспадаркі, транспарту; называць і тлумачыць асаблівасці размяшчэння, структуры насельніцтва, сучасныя дэмаграфічныя працэсы;

аналізаваць дынаміку міжнароднай міграцыі ў рэгіёнах свету; устанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі паміж геаграфічным становішчам, прыроднымі ўмовамі і гаспадарчай дзейнасцю чалавека на мацерыках, у рэгіёнах, краінах; комплексна характарызаваць мацярык, рэгіён, дзяржаву, краіну; тлумачыць асноўныя фактары размяшчэння вытворчасці на прыкладзе асобных галін (відаў дзейнасці) гаспадаркі; характарызаваць структуру сусветнай гаспадаркі, геаграфію сектараў сусветнай гаспадаркі;

аналізаваць прычыны і наступствы геаэкалагічных праблем геаграфічнай абалонкі і сацыяльна-эканамічных глабальных праблем.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### ФІЗІЧНАЯ ГЕАГРАФІЯ
### ЗЯМЛЯ НА ПЛАНЕ МЯСЦОВАСЦІ, ГЛОБУСЕ І КАРЦЕ

Бакі гарызонту. Арыентаванне на мясцовасці. Компас. Азімут. Вызначэнне азімутаў з дапамогай компаса і напрамкаў па зададзеных азімутах. План мясцовасці, умоўныя знакі і геаграфічная карта. Маштаб і яго віды. Вымярэнне адлегласцей па карце, на плане мясцовасці і

вызначэнне напрамкаў. Абсалютная і адносная вышыні. Вызначэнне абсалютнай вышыні паверхні сушы, глыбіні акіянаў і мораў.

Глобус – мадэль Зямлі. Геаграфічныя полюсы. Градусная сетка: паралелі, геаграфічны полюс, экватар, мерыдыяны, пачатковы мерыдыян. Геаграфічныя каардынаты. Сучасныя спосабы вызначэння геаграфічных каардынат. Геаграфічная карта. Адрозненні геаграфічнай карты ад плана мясцовасці. Выява вышынь і глыбінь на глобусе і карце. Легенда карты.

Адрозненні карт па маштабе, ахопу тэрыторыі, зместу. Значэнне карт у геаграфіі, жыцці і гаспадарчай дзейнасці людзей.

## ПРЫРОДА ЗЯМЛІ

Унутраная будова Зямлі: ядро, мантыя, зямная кара. Будова і магутнасць зямной кары. Тыпы зямной кары: мацерыковая і акіянічная.

Горныя пароды і мінералы зямной кары. Магматычныя, асадкавыя і метамарфічныя горныя пароды. Выкарыстанне і ахова нетраў Зямлі.

Унутраныя сілы Зямлі. Вулканізм. Утварэнне і будова вулкана. Адрозненне вулканаў па форме і актыўнасці. Вулканічныя паясы.

Землятрусы: прычыны і геаграфічнае распаўсюджванне. Сейсмічныя паясы. Знешнія сілы Зямлі. Выветрыванне: фізічнае, хімічнае, біялагічнае.

Рэльеф Зямлі. Асноўныя формы рэльефу сушы: раўніны, горы. Горныя краіны. Адрозненне раўнін па характары паверхні, па абсалютнай вышыні. Адрозненне гор па вышыні. Рэльеф дна Сусветнага акіяна.

Атмасфера. Састаў, будова і значэнне атмасферы. Азонавы пласт. Тэмпература паветра. Сярэдняя тэмпература, амплітуда тэмператур. Змяненне тэмпературы з вышынёй і размеркаванне тэмпературы паветра па зямной паверхні. Цеплавыя паясы.

Атмасферны ціск. Змяненне атмасфернага ціску з вышынёй і размеркаванне яго па зямной паверхні. Вецер. Напрамак, хуткасць і сіла ветру. Пастаянныя вятры, сезонныя вятры, мясцовыя вятры. Вільготнасць паветра: абсалютная і адносная. Атмасферныя ападкі і іх размеркаванне па зямной паверхні.

Надвор’е. Метэаралагічныя элементы. Назіранні за надвор’ем. Клімат. Кліматаўтваральныя фактары.

Гідрасфера. Будова гідрасферы. Сусветны акіян і яго часткі. Залівы. Пралівы. Тэмпература, салёнасць акіянічных вод. Рух вады ў акіяне. Цёплыя і халодныя акіянічныя плыні.

Воды сушы. Падземныя і паверхневыя воды. Віды падземных вод. Рака і яе часткі. Рачная даліна і яе элементы. Рачная сістэма, рачны басейн, водападзел. Раўнінныя і горныя рэкі. Вадаспады. Жыўленне рэк і водны рэжым рэк. Работа рэк, часовых вадацёкаў і падземных вод. Азёры. Асноўныя тыпы азёрных катлавін. Балоты, іх значэнне. Ледавікі, іх

утварэнне і будова. Мацерыковыя і горныя ледавікі. Уздзеянне ледавікоў на рэльеф. Значэнне гідрасферы ў жыцці людзей і яе ахова.

Біясфера і яе межы. Разнастайнасць жывых арганізмаў і асаблівасці іх размеркавання ў літасферы, гідрасферы, атмасферы. Роля жывых арганізмаў у біясферы. Глеба: састаў, будова, урадлівасць. Разнастайнасць глебавага покрыва. Значэнне глебы ў гаспадарчай дзейнасці людзей. Эрозія глеб. Прыродны комплекс і яго кампаненты. Разнастайнасць і ахова прыродных комплексаў Зямлі.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ЗЯМНОГА ШАРА

Тэорыя літасферных пліт. Глабальныя складкаватыя паясы. Платформы: будова (платформенныя пліты і шчыты) і іх адрозненне па ўзросту. Глабальныя формы рэльефу Зямлі: мацерыковыя ўзняцці і акіянічныя западзіны. Паходжанне гор.

Паветраныя масы і іх асноўныя тыпы. Атмасферныя франты. Цыклоны і антыцыклоны, звязаныя з імі тыпы надвор’я. Кліматычныя паясы Зямлі. Кліматычныя вобласці і тыпы клімату. Геаграфічныя паясы і прыродныя зоны Зямлі. Вышынная пояснасць.

## РЭГІЯНАЛЬНЫ АГЛЯД ЗЯМНОГА ШАРА

Акіяны: Атлантычны, Паўночны Ледавіты, Ціхі і Індыйскі. Агульная характарыстыка акіянаў: асаблівасці геаграфічнага становішча, межы, памеры, зрэзанасць берагавой лініі. Астравы і іх тыпы, моры, залівы, пралівы. Рэльеф дна акіянаў. Цячэнні і іх схемы. Мінеральныя і біялагічныя рэсурсы, іх выкарыстанне і ахова.

Мацерыкі: Афрыка, Аўстралія і Акіянія, Антарктыда, Паўднёвая Амерыка, Паўночная Амерыка, Еўразія.

Геаграфічнае становішча мацерыкоў і яго асаблівасці. Памеры, канфігурацыя і берагавая лінія. Гісторыя адкрыцця, геаграфічныя адкрыцці і даследаванні мацерыкоў: Б. Дыяш, Васка да Гама, Д. Лівінгстан, В. Янсзан, А. Я. Тасман, Дж. Кук, Ф. Ф. Белінсгаўзен, М. П. Лазараў, Р. Амундсен, Р. Скот, Х. Калумб, Ф. Магелан, А. Гумбальт, І. І. Дамейка, Э. Рыжы, В. І. Берынг, І. Д. Чэрскі, Б. І. Дыбоўскі. Шлях «з варагаў у грэкі» і Вялікі шаўковы шлях.

Будова зямной кары мацерыкоў. Платформы, складкаватыя вобласці і паясы. Асаблівасці рэльефу мацерыкоў і яго асноўныя формы. Роля старажытных мацерыковых абледзяненняў у фарміраванні рэльефу мацерыкоў. Карысныя выкапні і іх размяшчэнне.

Клімат мацерыкоў. Кліматычныя паясы і тыпы кліматаў. Кліматаўтваральныя фактары.

Водныя рэсурсы мацерыкоў. Паверхневыя воды. Асноўныя рачныя басейны і найбуйнейшыя рачныя сістэмы. Галоўныя рэкі, азёры, вадаспады,

каналы. Асаблівасці воднага рэжыму і гаспадарчага выкарыстання рэк. Багацце падземных вод і артэзіянскія басейны. Сучаснае абледзяненне. Вечная мерзлата.

Асноўныя рысы прыроды мацерыкоў. Геаграфічныя паясы і прыродныя зоны, асаблівасці іх распасцірання. Вышынная пояснасць. Асаблівасці арганічнага свету. Ахова прыроды і нацыянальныя паркі.

## ГЕАЭКАЛАГІЧНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ГЕАГРАФІЧНАЙ АБАЛОНКІ

Глабальныя праблемы чалавецтва і роля геаграфіі ў іх вырашэнні. Геаэкалагічныя праблемы літасферы. Геаэкалагічныя асаблівасці і функцыі літасферы. Роля біёты, чалавека і яго гаспадарчай дзейнасці ў вялікім (геалагічным) кругавароце рэчываў. Прыродныя прычыны трансфармацыі літасферы. Уплыў сучасных тэктанічных і геамарфалагічных працэсаў на стан навакольнага асяроддзя. Уплыў дзейнасці чалавека на літасферу. Уплыў горных работ на атмасферу і гідрасферу. Рэкультывацыя парушаных прыродных ландшафтаў.

Геаэкалагічныя праблемы атмасферы. Геаэкалагічныя асаблівасці і функцыі атмасферы. Значэнне атмасферы для чалавека і яго гаспадарчай дзейнасці. Кліматычныя рэсурсы. Уплыў дзейнасці чалавека на атмасферу. Антрапагеннае змяненне клімату. Магчымыя прычыны і наступствы змянення клімату. Геаэкалагічныя наступствы ўздзеяння магчымых змяненняў клімату на прыроду, гаспадарчую дзейнасць і здароўе чалавека.

Геаэкалагічныя праблемы гідрасферы. Геаэкалагічныя асаблівасці і функцыі гідрасферы. Значэнне гідрасферы для жыцця людзей. Водныя рэсурсы і водазабяспечанасць. Уздзеянне дзейнасці чалавека на воды сушы. Дэфіцыт і дэградацыя вод сушы. Геаэкалагічныя аспекты воднай гаспадаркі. Геаэкалагічныя праблемы Сусветнага акіяна. Антрапагеннае ўздзеянне на Сусветны акіян. Геаэкалагічныя наступствы забруджвання Сусветнага акіяна.

Геаэкалагічныя праблемы біясферы. Геаэкалагічныя асаблівасці біясферы. Роля біясферы ў геаграфічнай абалонцы і яе значэнне для жыцця людзей. Уплыў дзейнасці чалавека на біясферу. Уплыў прыродных фактараў і дзейнасці чалавека на зямельныя і глебавыя рэсурсы. Праблемы апустыньвання і абязлесення. Роля біёты ў біясферы і гаспадарчай дзейнасці чалавека. Біялагічная і прыродная разнастайнасць Зямлі і праблема яго захавання. Асабліва ахоўваемыя прыродныя тэрыторыі ў свеце, іх тыпы і значэнне.

# САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЯ І ПАЛІТЫЧНАЯ ГЕАГРАФІЯ СВЕТУ. ПАЛІТЫЧНАЯ КАРТА СВЕТУ. НАСЕЛЬНІЦТВА І ЯГО ГАСПАДАРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Сацыяльна-эканамічная геаграфія свету. Аб’ект і прадмет вывучэння, задачы ў забеспячэнні ўстойлівага развіцця. Рэгіёны свету ў сацыяльна-эканамічнай геаграфіі.

Палітычная карта свету і асаблівасці яе фарміравання. Аб’екты палітычнай карты свету. Краіны і дзяржавы ў сацыяльна-эканамічнай геаграфіі. Суверэнныя дзяржавы і залежныя тэрыторыі. Дзяржавы па формах праўлення і палітыка-тэрытарыяльным уладкаванні. Найбуйнейшыя краіны свету па памерах тэрыторыі і колькасці насельніцтва. Якасныя і колькасныя змены на палітычнай карце. Этапы фарміравання палітычнай карты свету. Рэгіянальныя і лакальныя канфлікты на палітычнай карце свету.

Палітычная геаграфія, прадмет, аб’ект і асноўныя напрамкі. Палітыка-геаграфічнае становішча краіны. Дзяржаўныя межы і формы змянення межаў. Памежныя спрэчкі. Прыкладна́я роля палітычнай геаграфіі. Геапалітыка, месца ў сістэме геаграфічных навук. Прастора ў геапалітыцы. Галоўныя геапалітычныя фактары развіцця краіны. Геапалітычныя працэсы свету ў канцы XX – пачатку XXI стагоддзя.

Колькасць насельніцтва свету. Дэмаграфічныя працэсы і іх геаграфія. Геаграфія нараджальнасці, смяротнасці насельніцтва свету.

Натуральны рух і ўзнаўленне насельніцтва ў свеце і рэгіёнах. Полаўзроставая структура насельніцтва свету, паказчыкі, тыпы. Полаўзроставая піраміда, віды пірамід. Адрозненні паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца. Геаграфія дэмаграфічнага старэння. Структура насельніцтва паводле полу ў свеце. Тэорыя дэмаграфічнага пераходу. Дынаміка колькасці насельніцтва, фактары, адрозненні ў свеце. Прагноз колькасці насельніцтва свету (паводле дадзеных ААН).

Міграцыі насельніцтва. Фактары і віды міграцыі насельніцтва. Міграцыйны пераход. Паказчыкі міграцыі. Міжнародная міграцыя ў сучасным свеце, дынаміка яе маштабаў у свеце і рэгіёнах. Міграцыя ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца, падабенства і адрозненні. Асноўныя калідоры міграцыі. Геаграфія палітычнай, эканамічнай, экалагічнай, студэнцкай міграцыі. Бежанства ў сучасным свеце, прычыны і геаграфія. Еўрапейскі міграцыйны крызіс. Міграцыйная палітыка.

Размяшчэнне насельніцтва свету, паказчыкі і фактары. Шчыльнасць насельніцтва свету і яе геаграфія. Геаграфія рассялення насельніцтва свету, фактары, формы. Гарады і сельскія паселішчы. Урбанізацыя свету і яе геаграфія. Стадыі і формы урбанізацыі. Агламерацыі, мегалаполісы, мегасіці. Адрозненні паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца.

Асноўныя расы і іх геаграфія. Этнічны склад насельніцтва свету. Геаграфія рэлігій свету. Геаграфія матэрыяльнай і духоўнай культуры. Аб’екты Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

Прыродныя рэсурсы. Вычарпальныя і невычарпальныя, аднаўляльныя і неаднаўляльныя прыродныя рэсурсы. Размяшчэнне радовішчаў асноўных відаў мінеральных рэсурсаў і іх узаемасувязь з геалагічнай пабудовай Зямлі.

Агульная характарыстыка гаспадаркі. Сусветная гаспадарка, этапы фарміравання і стадыі развіцця. Структура і прасторавыя мадэлі развіцця сусветнай гаспадаркі. Постындустрыялізм, перадумовы і рысы. Глабалізацыя сусветнай гаспадаркі, асноўныя этапы і тыпы. Глабальныя гарады. Сферы, галіны і віды гаспадарчай дзейнасці. Фактары размяшчэння гаспадаркі: сыравінны, энергетычны, працоўны, развіцця навукі і тэхналогій, спажывецкі, транспартны, экалагічны. Паняцце аб сусветным рынку, сусветным гандлі і сусветнай гаспадарцы. Тэрытарыяльны падзел працы. Міжнародны геаграфічны падзел працы (МГПП). Фактары і тыпы МГПП. Міжнародная спецыялізацыя і кааперыраванне. Найноўшыя змены ў міжнародным падзеле працы. Гаспадарчая спецыялізацыя. Паказчыкі ўзроўню сацыяльнаэканамічнага развіцця краін. Валавы ўнутраны прадукт (ВУП). Адрозненні краін па ўзроўні эканамічнага развіцця. Індэкс чалавечага развіцця (ІЧР). Групы краін па ўзроўні ІЧР. Транснацыяналізацыя сусветнай гаспадаркі, сутнасць і фактары развіцця. Транснацыянальныя карпарацыі (ТНК), іх разнавіднасці. Геаграфія, рэгіянальная і галіновая структура ТНК. Найбуйнейшыя ТНК свету. Міжнародная эканамічная інтэграцыя, перадумовы, стадыі. Вядучыя эканамічныя інтэграцыйныя аб’яднанні свету.

Сельская гаспадарка, яе галіновая структура, фактары размяшчэння і развіцця. Геаграфічныя тыпы сельскай гаспадаркі свету. Узаемасувязь сельскагаспадарчай дзейнасці з прыроднымі ўмовамі і рэсурсамі. Геаграфія раслінаводства і яго структура. Геаграфія вырошчвання збожжавых і тэхнічных культур, геаграфія вырошчвання бульбы. Геаграфія міжнароднага гандлю прадукцыяй раслінаводства. Геаграфія жывёлагадоўлі і яе галіновая структура. Геаграфія жывёлагадоўлі, свінагадоўлі, птушкагадоўлі і авечкагадоўлі. Экспарцёры і імпарцёры прадукцыі жывёлагадоўлі. Аграрная палітыка ў краінах Еўрапейскага саюза (ЕС).

Прамысловасць свету і фактары яе размяшчэння. Структура прамысловасці свету, галіны прамысловасці і віды эканамічнай дзейнасці. Уплыў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі (НТР) на галіновую структуру прамысловасці свету.

Здабыўная прамысловасць. Спосабы здабычы карысных выкапняў. Геаграфія здабычы найважнейшых энергетычных (нафты, газу, вугалю,

урану), рудных (руд чорных і каляровых (алюмінію, медзі) металаў) і нярудных (калійных солей, фасфарытаў) карысных выкапняў.

Геаграфія энергетыкі свету. Геаграфія нафтавай, газавай, вугальнай прамысловасці. Вытворчасць электраэнергіі. Геаграфія традыцыйнай і альтэрнатыўнай энергетыкі. Геаграфія міжнароднага гандлю ў энергетыцы. Тыпы электрастанцый (ЦЭС, ГЭС, АЭС). Геаграфія цеплавой і атамнай электраэнергетыкі, гідраэлектраэнергетыкі. Уздзеянне электраэнергетыкі на навакольнае асяроддзе.

Апрацоўчая прамысловасць. Металургія: вытворчасць чорных і каляровых металаў. Сыравіна і тэхналагічныя асаблівасці вытворчасці. Фактары размяшчэння металургічных вытворчасцей. Геаграфія вытворчасці чыгуну і сталі. Каляровая металургія свету і яе роля ў сусветнай гаспадарцы. Структура галіны і геаграфія найважнейшых падгалін: алюмініевай, меднай, цынкавай, свінцовай. Найбуйнейшыя ТНК металургіі. Геаграфія міжнароднага гандлю ў металургіі. Геаграфія машынабудавання свету, структура і фактары размяшчэння.

Геаграфія асноўных падгалін машынабудавання: транспартнае машынабудаванне (марское суднабудаванне, аўтамабілебудаванне, авіяракетна-касмічная прамысловасць), электронная і электратэхнічная прамысловасць, станкабудаванне. Сыравіна і тэхналагічныя асаблівасці вытворчасці. Найбуйнейшыя ТНК аўтамабілебудавання. Геаграфія міжнароднага гандлю прадукцыяй машынабудавання.

Геаграфія хімічнай прамысловасці свету, структура, роля ў развіцці сусветнай гаспадаркі. Сыравіна і фактары размяшчэння хімічных вытворчасцей. Геаграфія вытворчасцей мінеральных угнаенняў, прадуктаў неарганічнай хіміі і арганічнага сінтэзу. Рэгіёны хімічнай прамысловасці свету. Геаграфія фармацэўтычнай прамысловасці. Найбуйнейшыя ТНК галіны. Геаграфія міжнароднага гандлю хімічнай прадукцыяй.

Лясная гаспадарка і лясная прамысловасць. Цэлюлозна-папяровая вытворчасць. Сыравіна і фактары размяшчэння вытворчасці.

Лёгкая і харчовая прамысловасць, структура па відах вытворчасцей. Геаграфія тэкстыльнай і швейнай прамысловасці. Вытворчасць скуры і абутку. Геаграфія харчовай прамысловасці. Геаграфія міжнароднага гандлю прадукцыяй лёгкай і харчовай прамысловасці.

Сфера паслуг. Структура сферы паслуг. Сектар паслуг у сусветнай гаспадарцы, адрозненні ў структуры развітых краін і краін, якія развіваюцца. Геаграфія асноўных відаў паслуг і міжнароднага гандлю паслугамі. Асаблівасці развіцця і размяшчэння. Роля сферы паслуг у сучаснай гаспадарцы. Транспарт. Геаграфія транспарту і роля ў сусветнай гаспадарцы розных відаў транспарту. Геаграфія асноўных відаў транспарту ў свеце: наземнага (чыгуначнага, аўтамабільнага), воднага (марскога), паветранага (авіяцыйнага). Кантэйнерызацыя. Геаграфія міжнароднага

турызму. Роля міжнароднага турызму ў развіцці сусветнай гаспадаркі і сферы паслуг. Турыстычны патэнцыял свету і яго выкарыстанне. Геаграфія турысцкіх патокаў свету. Засваенне новых тэрыторый свету для развіцця турызму на постындустрыяльнай стадыі. Геаграфія фінансавых паслуг у свеце. Найбуйнейшыя фінансавыя цэнтры свету. Міжнародныя фінансавыя арганізацыі і іх роля ў развіцці сусветнай гаспадаркі. Крыптавалюта і яе роля ў сусветнай гаспадарцы. Геаграфія экспарту і імпарту фінансавых паслуг. Геаграфія сектара інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій (ІКТ) свету. Міжнародны геаграфічны падзел працы (МГПП) у сектары ІКТ. Узровень развіцця ІКТ і адрозненні паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца. Лічбавізацыя сусветнай гаспадаркі.

## РЭГІЯНАЛЬНЫ АГЛЯД СВЕТУ

Рэгіёны свету (класіфікацыя ААН): Еўропа, Азія, Амерыка, Афрыка, Аўстралія і Акіянія.

Сацыяльна-эканамічныя рэгіёны Еўропы (Паўночная Еўропа, Заходняя Еўропа, Паўднёвая Еўропа, Усходняя Еўропа). Краіны Паўночнай Еўропы: Вялікабрытанія, Фінляндыя, Швецыя, Данія, Ісландыя, Нарвегія, Літва, Латвія, Эстонія; краіны Заходняй Еўропы: Германія, Францыя; Паўднёвая Еўропа: Італія; краіны Усходняй Еўропы. Польшча, Украіна. Эканоміка-геаграфічная характарыстыка краін, эканоміка-геаграфічнае становішча; прыродныя ўмовы і рэсурсы; насельніцтва і асаблівасці дэмаграфічнага развіцця; уплыў прыроднасыравіннай базы на структуру гаспадаркі; геаграфія прамысловасці, сельскай гаспадаркі, сферы паслуг; знешнія эканамічныя сувязі.

Расійская Федэрацыя. Расія на палітычнай карце свету. Тэрыторыя і эканоміка-геаграфічнае становішча Расіі. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Расійскай Федэрацыі. Геаграфічныя перадумовы развіцця міждзяржаўных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй. Насельніцтва. Дэмаграфічныя працэсы. Дынаміка колькасці і натуральнага прыросту насельніцтва. Полаўзроставая структура насельніцтва Расіі. Нацыянальны і рэлігійны склад насельніцтва. Размяшчэнне насельніцтва Расіі. Геаграфія прамысловасці Расіі. Прыродна-рэсурсны патэнцыял. Здабыўная прамысловасць. Апрацоўчая прамысловасць. Вядучыя галіны апрацоўчай прамысловасці і іх геаграфія. Геаграфія вытворчасці электраэнергіі. Геаграфія сельскай гаспадаркі: асаблівасці развіцця і размяшчэння. Занальная спецыялізацыя сельскай гаспадаркі. Асаблівасці развіцця і галіны раслінаводства Расіі. Геаграфія развядзення жывёл. Сфера паслуг.

Азія. Сацыяльна-эканамічныя рэгіёны Азіі (Усходняя Азія, Паўднёвая Азія, Цэнтральная Азія, Заходняя Азія).

Краіны Усходняй Азіі: Японія, Кітай; Паўднёвая Азія: Індыя; краіны Цэнтральнай Азіі: Казахстан, Узбекістан, Таджыкістан, Туркменістан, Кыргызстан; краіны Заходняй Азіі: Грузія, Арменія, Азербайджан. Эканоміка-геаграфічная характарыстыка краін: эканомікагеаграфічнае становішча; прыродныя ўмовы і рэсурсы; насельніцтва і асаблівасці дэмаграфічнага развіцця; уплыў прыродна-сыравіннай базы на структуру гаспадаркі; геаграфія прамысловасці, сельскай гаспадаркі, сферы паслуг; знешнія эканамічныя сувязі.

Сацыяльна-эканамічныя рэгіёны Амерыкі: Паўночная і Цэнтральная Амерыка. Палітычная карта. Насельніцтва і дэмаграфічныя асаблівасці. Краіны Паўночнай Амерыкі: Злучаныя Штаты Амерыкі (ЗША), Канада. Эканоміка-геаграфічная характарыстыка краін: эканоміка-геаграфічнае становішча; прыродныя ўмовы і рэсурсы; насельніцтва і асаблівасці дэмаграфічнага развіцця; уплыў прыроднасыравіннай базы на структуру гаспадаркі; геаграфія прамысловасці, сельскай гаспадаркі, сферы паслуг; знешнія эканамічныя сувязі. Краіны Цэнтральнай Амерыкі. Мексіка: эканоміка-геаграфічнае становішча; прыродныя ўмовы і рэсурсы; дэмаграфічныя асаблівасці; геаграфія прамысловасці, сельскай гаспадаркі, сферы паслуг; знешнія эканамічныя сувязі.

Паўднёвая Амерыка. Палітычная карта Паўднёвай Амерыкі. Насельніцтва і асаблівасці дэмаграфічнага развіцця. Геаграфія прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Транспарт. Экалагічныя праблемы гаспадарчага асваення рэгіёна. Бразілія: эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы; дэмаграфічныя асаблівасці; геаграфія прамысловасці, сельскай гаспадаркі, сферы паслуг; знешнія эканамічныя сувязі.

Афрыка. Палітычная карта Афрыкі. Геапалітычныя праблемы. Дэмаграфічныя асаблівасці. Этнічны і рэлігійны склад насельніцтва. Асаблівасці структуры валавога ўнутранага прадукту краін Афрыкі. Геаграфія сферы паслуг і прамысловасці. Асаблівасці развіцця сельскай гаспадаркі. Монакультурная гаспадарка краін Афрыкі. Эканоміка-геаграфічная характарыстыка краін рэгіёна: Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка, Егіпет.

Аўстралія і Акіянія. Аўстралійскі Саюз. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. Насельніцтва і асаблівасці дэмаграфічнага развіцця. Прамысловасць. Сельская гаспадарка. Акіянія.

Палітычная карта. Новая Зеландыя. Гаспадарчая дзейнасць насельніцтва.

## САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫЯ ГЛАБАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ

Дэмаграфічныя праблемы. Праблема дэмаграфічнай нагрузкі. Нераўнамернасць росту колькасці насельніцтва свету. Дэмаграфічны выбух

і дэпапуляцыя ў свеце. Дэмаграфічная палітыка і яе асаблівасці ў розных рэгіёнах і краінах. Сутнасць, праблемы і наступствы старэння насельніцтва. Глабальны характар і наступствы міжнароднай міграцыі. Унутрана перамешчаныя асобы (УПА) і праблема бежанства ў сучасным свеце. Міграцыйная палітыка ў свеце. Замяшчальная міграцыя як форма дэмаграфічнай палітыкі.

Харчовая праблема, прычыны голаду ў свеце. Геаграфія і структура харчавання насельніцтва. Рэгіянальныя аспекты голаду і харчовай праблемы. Міжнароднае вымярэнне голаду. Шляхі вырашэння харчовай праблемы. Харчовая бяспека. Вымярэнне харчовай бяспекі.

Праблема вычарпання мінеральна-сыравінных рэсурсаў свету, сутнасць і прычыны. Прыродна-рэсурсны патэнцыял тэрыторыі. Геаграфія запасаў і рэсурсазабяспечанасць свету асноўнымі відамі мінеральных рэсурсаў. Рэсурсны цыкл. Шляхі вырашэння праблемы вычарпання мінеральна-сыравінных рэсурсаў. Дынаміка, геаграфія і аб’ёмы спажывання мінеральна-сыравінных рэсурсаў у развітых краінах і краінах, якія развіваюцца.

Прычыны глабальнай энергетычнай праблемы. Дынаміка і прагноз спажывання энергетычных рэсурсаў у развітых краінах і краінах, якія развіваюцца. Шляхі вырашэння глабальнай энергетычнай праблемы. Рацыянальнае выкарыстанне энергетычных рэсурсаў свету і энергазберажэнне. Усеагульны доступ да сучасных крыніц энергіі. Энергетычная бяспека. Перспектывы развіцця альтэрнатыўнай энергетыкі.

Геапалітычныя праблемы XXI стагоддзя, прычыны і наступствы. Праблемы рэгіянальных канфліктаў міжнароднага тэрарызму. Прычыны і формы міжнароднага тэрарызму. Міжнародныя меры пераадолення праблемы міжнароднага тэрарызму. Праблема захавання міру. Сутнасць праблемы захавання міру і бяспекі. Праблема раззбраення. Праблема прадухілення ядзернай вайны і скарачэння ўзбраенняў.

Рацыянальнае прыродакарыстанне і ўстойлівае развіццё чалавецтва. Гісторыя ўзаемадзеяння чалавека і прыроды. Прыродакарыстанне і яго асноўныя тыпы. Геаэкалагічныя прынцыпы, правілы, законы прыродакарыстання і аховы навакольнага асяроддзя. Шляхі вырашэння глабальных праблем. Асаблівасці ўспрымання чалавекам праблем навакольнага асяроддзя. Гуманітарна-экалагічны падыход і яго значэнне ў вырашэнні глабальных праблем.

Устойлівае развіццё чалавецтва. Паняцце і асноўныя прынцыпы ўстойлівага развіцця чалавецтва. Мэты ў галіне ўстойлівага развіцця чалавецтва на перыяд да 2030 года. Геаграфічныя аспекты Мэт устойлівага развіцця чалавецтва. Нацыянальная стратэгія ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2030 года.

Геаграфія ў сучасным свеце і яе галоўныя функцыі. Перспектывы развіцця геаграфіі. Міжнароднае супрацоўніцтва ў галіне геаграфіі і вырашэння глабальных праблем чалавецтва.

## ГЕАГРАФІЯ БЕЛАРУСІ

Месца геаграфіі Беларусі ў развіцці геаграфічных ведаў аб Зямлі. Фізіка- і эканоміка-геаграфічнае становішча Рэспублікі Беларусь. Велічыня, канфігурацыя тэрыторыі і дзяржаўныя межы. Фарміраванне дзяржаўнай тэрыторыі Беларусі. Сучасны адміністрацыйнатэрытарыяльны падзел краіны. Геаграфічныя даследаванні тэрыторыі Беларусі да 1918 г. і ў даваенны час. Працы А. А. Смоліча. Сучасныя даследаванні. Роля геаграфіі ў вырашэнні сучасных гаспадарчых задач. Геаграфічныя назвы Беларусі і іх паходжанне.

Геалагічная будова. Крышталічны падмурак і найбуйнейшыя тэктанічныя структуры. Геахраналагічная шкала. Асаблівасці фарміравання платформавага чахла ў дачэтверцічны час. Адклады верхняга пратэразою, палеазою, мезазою і кайназою. Фарміраванне тэрыторыі ў чацвярцічным перыядзе. Мацерыковыя абледзяненні і міжледавікоўі. Асноўныя генетычныя тыпы чацвярцічных адкладаў. Карысныя выкапні. Мінеральныя рэсурсы. Гаручыя карысныя выкапні. Металічныя карысныя выкапні. Горна-хімічная сыравіна і сыравіна для вытворчасці будаўнічых матэрыялаў. Падземныя воды.

Рэльеф. Генетычныя тыпы рэльефу і фактары фарміравання. Уплыў дзейнасці чалавека на змяненне рэльефу.

Клімат і кліматычныя рэсурсы. Агульныя рысы клімату Беларусі. Сонечная радыяцыя. Паветраныя масы і атмасферная цыркуляцыя. Цеплавы рэжым. Вільготнасць паветра, воблачнасць і ападкі. Сезоны года і іх асаблівасці. Кліматычныя рэсурсы. Сучасныя змяненні клімату. Паверхневыя воды. Гідраграфічная сетка. Басейны галоўных рэк. Жыўленне рэк і асаблівасці іх гідралагічнага рэжыму. Каналы і водныя шляхі. Азёры, вадасховішчы і сажалкі, іх размяшчэнне. Тыпы азёрных катлавін Беларусі па паходжанні. Балоты і іх тыпы. Гаспадарчае значэнне паверхневых вод. Глебы. Фактары і працэсы глебаўтварэння. Асноўныя тыпы глеб, іх распаўсюджванне. Зямельныя рэсурсы і іх выкарыстанне. Меліярацыя глеб. Расліннасць. Сучасны састаў флоры. Асноўныя тыпы расліннасці. Занальная і азанальная расліннасць. Лясная расліннасць. Тыпы лясоў. Лясістасць тэрыторыі і яе змяненне. Лугавая, балотная, хмызняковая расліннасць, расліннасць вадаёмаў. Гаспадарчае выкарыстанне і ахова расліннага свету. Жывёльны свет. Сучасны састаў фаўны. Жывёльны свет лясоў, палёў і лугоў, балот, вадаёмаў і іх узбярэжжаў, паселішчаў чалавека. Гаспадарчае выкарыстанне і ахова жывёльнага свету.

Геаграфічныя ландшафты, распаўсюджванне і асноўныя тыпы. Распаўсюджанне асноўных прыродных ландшафтаў. Асноўныя роды ландшафтаў Беларусі і іх характарыстыка. Антрапагенныя ландшафты. Асваенне тэрыторыі і яго віды. Прыродна-рэсурсны патэнцыял. Рэкрэацыйныя рэсурсы. Зоны адпачынку і курорты. Турысцкія комплексы і маршруты, аграсядзібы. Перспектывы выкарыстання рэкрэацыйных рэсурсаў.

Геаэкалагічныя праблемы Беларусі. Забруджванне тэрыторыі радыенуклідамі ў выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Праблемы Палесся, Салігорскага горнапрамысловага раёна. Лакальныя праблемы забруджвання атмасфернага паветра, паверхневых і падземных вод, глеб у выніку гаспадарчай дзейнасці. Прыродаахоўныя тэрыторыі. Запаведнікі, прыродныя нацыянальныя паркі, заказнікі і помнікі прыроды рэспубліканскага і мясцовага значэння.

Сутнасць прыроднага раяніравання і яго віды. Фізіка-геаграфічнае раяніраванне Беларусі. Фізіка-геаграфічныя правінцыі: Беларуская Паазерская, Перадпалеская, Палеская, Заходне-Беларуская і Усходне-Беларуская. Геаграфічнае становішча правінцыі. Асаблівасці прыроды: геалагічная будова, карысныя выкапні, рэльеф; клімат і гідраграфія; глебава-расліннае покрыва; жывёльны свет.

Колькасць і размяшчэнне насельніцтва Рэспублікі Беларусь. Шчыльнасць насельніцтва. Фактары, якія ўплываюць на размяшчэнне насельніцтва Беларусі. Нараджальнасць, смяротнасць і натуральны прырост насельніцтва. Структура насельніцтва Беларусі паводле полу і ўзросту. Унутраныя і знешнія міграцыі насельніцтва краіны. Працоўныя рэсурсы Беларусі. Праблемы занятасці працоўных рэсурсаў. Этнічны і рэлігійны склад насельніцтва. Гарадское і сельскае насельніцтва краіны. Найбуйнейшыя гарады. Гарады-спадарожнікі. Сельскае рассяленне. Сельскія паселішчы і іх тыпы. Аграгарадкі.

Нацыянальная эканоміка Беларусі. Дынаміка ВУП. Сучасная структура эканомікі Беларусі: сферы, галіны, віды эканамічнай дзейнасці. Структура сферы вытворчасці. Структура прамысловасці. Структура сферы паслуг. Тэрытарыяльная структура эканомікі краіны. Фактары, якія абумоўліваюць размяшчэнне вытворчасці. Найважнейшыя сацыяльна-эканамічныя цэнтры краіны. Геаграфія сельскай гаспадаркі. Роля сельскай гаспадаркі ў эканоміцы краіны. Структура і размяшчэнне зямельных угоддзяў. Геаграфія раслінаводства (збожжавая гаспадарка, бульбаводства, агароднiцтва, садоўніцтва, вырошчванне тэхнічных культур). Геаграфія жывёлагадоўлі (развядзенне буйной рагатай жывёлы, свінагадоўля, птушкагадоўля і іншыя галіны). Геаграфія лясной гаспадаркі. Структура і роля лясной гаспадаркі ў эканоміцы краіны. Геаграфія лесанарыхтовак. Геаграфія найбуйнейшых паляўнічых угоддзяў краіны. Геаграфія

рыбалоўства і рыбаводства. Геаграфія прамысловасці. Горназдабыўная прамысловасць, яе састаў, роля ў структуры гаспадаркі і паказчыкі развіцця. Здабыча нафты і спадарожнага газу, торфу. Геаграфія здабычы карысных выкапняў для хімічнай прамысловасці. Здабыча і вытворчасць каменнай солі. Здабыча карысных выкапняў для вытворчасці будаўнічых матэрыялаў. Электраэнергетыка. Фактары размяшчэння, умовы развіцця, геаграфія вытворчасці і размеркавання электраэнергіі. Цеплавыя і гідраўлічныя электрастанцыі краіны. Альтэрнатыўныя крыніцы электраэнергіі і перспектывы іх выкарыстання ў беларускай энергетыцы. Развіццё атамнай электраэнергетыкі. Нафтавая і нафтаперапрацоўчая, газаперапрацоўчая прамысловасць. Фактары размяшчэння вытворчасці нафтапрадуктаў. Найбуйнейшыя нафтаправоды і цэнтры нафтаперапрацоўкі. Металургія. Структура, фактары размяшчэння і геаграфія металургічнай вытворчасці. Геаграфія вытворчасці гатовых металічных вырабаў. Машынабудаванне. Фактары размяшчэння і геаграфія вытворчасці аўтамабіляў, аўтобусаў, тралейбусаў, суднаў, цеплавозаў і вагонаў, авіяцыйнай тэхнікі, матацыклаў і веласіпедаў. Фактары размяшчэння і геаграфія вытворчасці трактароў і сельскагаспадарчай тэхнікі, дарожна-будаўнічай тэхнікі, вытворчасці станкоў, электраабсталявання, электроннага і аптычнага абсталявання, прыбораў і бытавой тэхнікі. Хімічная прамысловасць. Састаў, сыравінная база, фактары размяшчэння. Развіццё і размяшчэнне вытворчасці мінеральных угнаенняў, штучных і сінтэтычных валокнаў, пластмас, сінтэтычнага каўчуку, шын і гуматэхнічных вырабаў, фарбаў і лакаў, прадукцыі бытавой хіміі, фармацэўтычнай прадукцыі. Вытворчасць будаўнічых матэрыялаў. Фактары размяшчэння і геаграфія вытворчасці шкла і вырабаў са шкла, керамічных вырабаў, цэменту, вапны і гіпсу, вырабаў з бетону. Дрэваапрацоўчая, мэблевая і цэлюлозна-папяровая прамысловасць. Апрацоўка драўніны і вытворчасць вырабаў з дрэва. Размяшчэнне вытворчасці фанеры, пліт, драўляных будаўнічых канструкцый і сталярных вырабаў. Фактары размяшчэння і геаграфія вытворчасці мэблі. Фактары размяшчэння і асноўныя цэнтры цэлюлознапапяровай вытворчасці. Лёгкая прамысловасць. Фактары размяшчэння і геаграфія вытворчасці тканін, адзення, трыкатажных і панчошнашкарпэткавых вырабаў. Сыравінная база і фактары размяшчэння вытворчасці скуры, вырабаў са скуры, абутку. Найбуйнейшыя цэнтры гарбарнай і абутковай вытворчасці. Харчовая прамысловасць. Фактары размяшчэння і геаграфія вытворчасці мяса і мясапрадуктаў, малочных прадуктаў, рыбы і рыбных прадуктаў, алеяў і тлушчаў, прадуктаў мукамольна-крупяной прамысловасці, цукру. Сфера паслуг. Структура сферы паслуг, яе роля ў эканоміцы. Геаграфія гандлю, інфармацыйнакамунікацыйных тэхналогій, фінансавай дзейнасці. Геаграфія адукацыі, аховы здароўя, турызму і іншых відаў дзейнасці ў

сферы паслуг. Геаграфія транспарту. Асаблівасці, характэрныя рысы развіцця і геаграфія асноўных відаў транспарту Беларусі: аўтамабільнага, чыгуначнага, рачнога, авіяцыйнага, трубаправоднага. Галоўныя транспартныя магістралі краіны. Знешнеэканамічныя сувязі Беларусі. Месца краіны ў міжнародным падзеле працы. Геаграфія знешняга гандлю. Галоўныя эканамічныя партнёры Беларусі. Знешнегандлёвы баланс краіны. Замежныя інвестыцыі і іх роля ў развіцці краіны. Свабодныя эканамічныя зоны, сумесныя і замежныя прадпрыемствы на тэрыторыі Беларусі.

Вобласці: Брэсцкая, Віцебская, Гомельская, Гродзенская, Мінская, Магілёўская; горад Мінск. Прыродныя рэсурсы, насельніцтва, нацыянальны склад насельніцтва па абласцях. Структура прамысловасці і сельскай гаспадаркі, асаблівасці іх размяшчэння. Спецыялізацыя гаспадаркі. Найбуйнейшыя прамысловыя і культурныя цэнтры абласцей.

## ГЕАГРАФІЧНАЯ НАМЕНКЛАТУРА

Мацерыкі: Еўразія, Паўночная Амерыка, Паўднёвая Амерыка, Афрыка, Аўстралія, Антарктыда.

Часткі свету: Афрыка, Еўропа, Азія, Амерыка, Аўстралія і Акіянія, Антарктыда.

Рэгіёны: Лацінская Амерыка.

Астравы і групы астравоў: Вялікабрытанія, Ісландыя, Японскія, Мадагаскар, Вялікі Бар’ерны рыф, Новая Гвінея, Гавайскія, Тасманія, Новая Зеландыя, Вогненная Зямля, Грэнландыя, Канадскі Арктычны архіпелаг, Вялікія Зондскія.

Паўастравы: Самалі, Кейп-Ёрк, Арнем-Ленд, Антарктычны, Лабрадор, Скандынаўскі, Пірэнейскі, Аравійскі, Індакітай, Індастан.

Тэктанічныя структуры

Літасферныя пліты: Еўразійская, Паўднёва-Амерыканская, Ціхаакіянская.

Складчатыя паясы: Ціхаакіянскі, Альпійска-Гімалайскі, Урала-Мангольскі.

Платформы і іх часткі: Аравійская, Індастанская, Усходне-Еўрапейская, Заходне-Сібірская пліта, Аўстралійская, Антарктычная, Паўночна-Амерыканская, Украінскі шчыт, Беларуская антэкліза, Варонежская антэкліза, Аршанская ўпадзіна, Прыпяцкі прагіб, Жлобінская седлавіна, Палеская седлавіна, Мікашэвіцка-Жыткавіцкі выступ.

Упадзіны сушы: Гхор, возера Асаль, Бэнтлі, Даліна Смерці.

Нізіны і раўніны: Прыкаспійская, Інда-Гангская, Амазонская, Арынокская, Лаплацкая, Цэнтральныя, Вялікія, Нарачана-Вілейская, Цэнтральнабярэзінская, Лідская, Вялікая Кітайская, Заходне-Сібірская, Палеская, Полацкая.

Узвышшы: Усходне-Еўрапейская раўніна, Лаўрэнційскае, Беларуская града, Браслаўскія грады, Ашмянская, Віцебская, Мінская, Навагрудская, Мазырская.

Нагор'і і пласкагор'і: Сярэднесібірскае, Дэкан, Эфіёпскае, Усходне-Афрыканскае, Заходне-Аўстралійскае, Бразільскае, Гвіянскае, Мексіканскае.

Плато: Вялікі Басейн.

Горы: Альпы, Атлас, Вялікі Водападзельны хрыбет, Каўказ, Уральскія, Гімалаі (г. Джамалунгма), Кардыльеры, Анды, Скандынаўскія, Драконавы, Пірэнеі, Капскія, г. Касцюшкі, Трансантарктычныя, Антарктычныя Анды, масіў Вінсан, Аканкагуа, Дэналі, Скалістыя, Апалачы, Карпаты, Цянь-Шань.

Вулканы: Везувій, Кіліманджара, Гекла, Фудзіяма, Камерун, Кілаўэа, Эрэбус, Катапахі, Арысаба, Ключэўская Сопка, Ціхаакіянскае вулканічнае (вогненнае) кальцо.

Пустыні: Сахара, Наміб, Вялікая пустыня Вікторыя, Атакама, Гобі, Руб-эль-Халі.

Рэкі: Амазонка, Місісіпі, Ніл, Мурэй, Янцзы, Нігер, Замбезі, Дарлінг, Купер-Крык, Парана, Арынока, Святога Лаўрэнція, Каларада, Макензі, Юкон, Дунай, Об, Волга, Енісей, Лена, Амур, Хуанхэ, Днепр, Бярэзіна, Заходняя Дзвіна, Заходні Буг, Нёман, Прыпяць, Вілія.

Каналы: Суэцкі, Панамскі, Дняпроўска-Бугскі, Аўгустоўскі.

Азёры: Байкал, Верхняе, Каспійскае мора, Чад, Вікторыя, Танганьіка, Эйр-Норт, Усход, Ціцікака, Вялікае Мядзведжае, Вялікае Салёнае, Ладажскае, Аральскае мора, Мёртвае мора, Нарач, Асвейскае, Чырвонае, Дрывяты, Доўгае.

Вадасховішчы: Вілейскае, Заслаўскае.

Вадаспады: Анхель, Вікторыя, Ігуасу, Ніягарскі.

Ледавікі: Федчанка, шэльфавы ледавік Роса.

Балоты: Васюганскія.

Акіяны: Атлантычны, Індыйскі, Паўночны Ледавіты, Ціхі. Моры: Міжземнае, Чырвонае, Балтыйскае, Ахоцкае, Аравійскае, Баранцава, Роса, Уэдэла, Карыбскае, Берынгава, Паўночнае, ПаўднёваКітайскае.

Залівы: Гвінейскі, Бенгальскі, Вялікі Аўстралійскі, Мексіканскі, Аляска, Персідскі, Адэнскі, Карпентарыя, Ла-Плата, Гудзонаў, Біскайскі.

Пралівы: Берынгаў, Гібралтарскі, Магеланаў, Мазамбікскі, Дрэйка, Дэвісаў, Басфор.

Формы рэльефу сусветнага акіяна

Сярэдзінна-акіянічны хрыбет: Сярэдзінна-Атлантычны.

Катлавіны: Паўночна-Усходняя, Канадская, Конга.

Жалабы: Марыянскі, Зондскі, Чылійскі.

Цячэнні: Гальфстрым, Заходніх Вятроў, Курасіа, Паўночнае Пасатнае, Паўднёвае Пасатнае, Паўночна-Атлантычнае, Лабрадорскае, Бразільскае, Мазамбікскае, Бенгельскае, Перуанскае, Каліфарнійскае, Аляскінскае.

Заходне-Сібірскі артэзіянскі басейн.

Запаведнік: Бярэзінскі біясферны.

Нацыянальныя паркі: Белавежская пушча, Браслаўскія азёры, Нарачанскі, Прыпяцкі. Заказнікі: Налібоцкі, Ельня.

Правінцыі: Беларуская Паазерская, Заходне-Беларуская, Усходне-Беларуская, Перадпалеская, Палеская.

Краіны-лідэры па колькасці насельніцтва (Індыя, Кітай, ЗША); краіна з максімальнай нараджальнасцю насельніцтва ў свеце (Нігер); краіна з максімальнай смяротнасцю насельніцтва ў свеце (Балгарыя).

Краіны свету з высокімі тэмпамі росту колькасці насельніцтва (Нігер, Малі, Маўрытанія); краіны свету з высокімі тэмпамі скарачэння колькасці насельніцтва (Балгарыя, Сербія, Украіна).

Краіны з мінімальнай нараджальнасцю насельніцтва ў свеце (Рэспубліка Карэя, Сан-Марына, Андора); краіны з мінімальнай смяротнасцю насельніцтва ў свеце (Катар, Аман, Бахрэйн); краіна з максімальным натуральным прыростам (Нігер); краіна з максімальным натуральным змяншэннем (Балгарыя); краіна з максімальнай доляй насельніцтва ва ўзросце 65+ гадоў (Манака).

Краіны з прагрэсіўнай узроставай структурай насельніцтва (Малаві, Афганістан, Гандурас), стацыянарнай узроставай структурай насельніцтва (Аўстралія, Канада, Чылі) і рэгрэсіўнай узроставай структурай насельніцтва (Балгарыя, Германія, Грэцыя).

Краіны са станоўчай дынамікай колькасці насельніцтва (Нігерыя, Егіпет, Эквадор), з адмоўнай дынамікай колькасці насельніцтва (Японія, Германія, Італія).

Краіна з максімальнай шчыльнасцю насельніцтва ў свеце (Манака); краіна з мінімальнай шчыльнасцю насельніцтва ў свеце (Манголія); краіны з максімальнай доляй гарадскога насельніцтва (Сінгапур, Кувейт, Науру); краіны з мінімальнай доляй гарадскога насельніцтва (Папуа Новая Гвінея, Бурундзі, Нігер).

Асноўныя калідоры міжнародных міграцый Мексіка – ЗША, Сірыя – Турцыя, Індыя – ААЭ; краіны паходжання найбольшай колькасці бежанцаў (Сірыя, Афганістан, Паўднёвы Судан).

Найбуйнейшыя агламерацыі свету: Токіа-Ёкагама, Джакарта, Дэлі.

Вядучыя мегалаполісы свету: Паўночна-Усходні або «Босваш», Прыазёрны або «Чыпітс», «Сансан», Транс’еўрапейскі, «Такайда». Прыклады краін з трушчобным характарам рассялення: Бразілія, Індыя, Нігерыя.

Краіны свету з праблемай голаду: Емен, Малі, Судан, Дэмакратычная Рэспубліка Конга, Калумбія, Сірыя, Чад, Цэнтральнаафрыканская Рэспубліка.

Краіны-лідэры па валавому збору: пшаніцы (Кітай, Індыя, Расія); рысу (Кітай, Індыя, Бангладэш); кукурузы (ЗША, Кітай, Бразілія); пагалоўю буйной рагатай жывёлы (Бразілія, Індыя, ЗША); свіней (Кітай, ЗША, Бразілія); авечак (Кітай, Індыя, Аўстралія).

Краіны-лідэры па вытворчасці: мяса (Кітай, ЗША, Бразілія), малака (Індыя, ЗША, Кітай), швейнай прадукцыі (Кітай, Індыя, Бангладэш, В’етнам, Турцыя).

Нафтагазаносныя правінцыі: Персідскага заліва, Мексіканская, Заходне-Афрыканская, Паўночнага мора, Заходне-Сібірская, ВолгаУральская, Цімана-Пячорская.

Вугальныя басейны: Рурскі, Верхнесілезскі, Канска-Ачынскі буравугальны, Пячорскі.

Басейны і радовішчы: жалезных руд (Курская магнітная анамалія, Расія), Каражас (Бразілія), вугалю (Тунгускі, Расія), (Апалацкі, ЗША).

Вядучыя краіны па здабычы: нафты (ЗША, Расія, Саудаўская Аравія), прыроднага газу (ЗША, Расія, Іран), вугалю (Кітай, Індыя, Інданезія).

Вядучыя краіны – вытворцы электраэнергіі (Кітай, ЗША, Індыя).

Найбуйнейшыя гідраэлектрастанцыі (ГЭС) свету (Санься, Байхэтань, Ітайпу); найбуйнейшыя атамныя электрастанцыі (АЭС) свету (Касівадзакі-Карыва, Коры, Брус); вядучыя краіны – вытворцы сонечнай электраэнергіі (Кітай, ЗША, Японія), вядучыя краіны – вытворцы ветравой электраэнергіі (Кітай, ЗША, Германія), вядучыя краіны – вытворцы геатэрмальнай электраэнергіі (ЗША, Інданезія, Філіпіны).

Краіны свету са скарачэннем спажывання энергіі (Эстонія, Украіна, Венесуэла), з найбольшымі аб’ёмамі спажывання энергіі (Кітай, ЗША, Індыя).

Краіны-лідэры па аб’ёмах вытворчасці: чыгуну (Кітай, Індыя, Японія), сталі (Кітай, Індыя, Японія), першаснага алюмінію (Кітай, Індыя, Расія), рафінаванай медзі (Кітай, Чылі, Японія), рафініраванага цынку (Кітай, Індыя, ЗША), рафінаванага свінцу (Кітай, ЗША, Германія).

Вядучыя краіны-вытворцы: марскіх судоў (Кітай, Рэспубліка Карэя, Японія), легкавых аўтамабіляў (Кітай, Японія, Індыя), станкоў (Кітай, Японія, Германія), калійных угнаенняў (Канада, Расія, Беларусь), азотных угнаенняў (Кітай, Індыя, ЗША), фосфарных угнаенняў (Кітай, Марока, ЗША), хімічных валокнаў (Кітай, Індыя, ЗША).

Цэнтры хімічнай і лясной прамысловасці Расіі: Салікамск, Бярэзнікі, Омск, Архангельск, Брацк.

Вядучыя марскія парты свету па грузаабароце: Нінбо Чжоўшан, Шанхай, Таншань, Ціндао, Гуанчжоу, Сінгапур; вядучыя аэрапорты свету

па пасажыраабароце: Хартсфілд-Джэксан Атланта (ЗША), Дубай (ААЭ), Далас/Форт-Уэрт (ЗША), Токіо Ханэда (Японія), Лондан Хітроў (Вялікабрытанія), Дэнвер (ЗША).

Краіны-лідэры па аб'ёме: экспарту паслуг (ЗША, Вялікабрытанія, Кітай), імпарту паслуг (ЗША, Кітай, Германія).

Дзяржавы і іх сталіцы, эканамічныя цэнтры: Германія (Берлін, Гамбург, Мюнхен), Вялікабрытанія (Лондан, Бірмінгем, Лідс), Францыя (Парыж, Марсель, Ліён), Нарвегія (Осла), Швецыя (Стакгольм), Данія (Капенгаген), Фінляндыя (Хельсінкі), Партугалія (Лісабон), Іспанія (Мадрыд, Барселона, Валенсія), Італія (Рым, Мілан, Неапаль), Грэцыя (Афіны), Польшча (Варшава, Кракаў, Лодзь), Літва (Вільнюс), Латвія (Рыга), Эстонія (Талін), Украіна (Кіеў, Харкаў, Адэса), Японія (Токіа, Ёкагама), Кітай (Пекін, Шанхай), Індыя (Дэлі, Мумбаі), Казахстан (Астана, Алматы), Узбекістан (Ташкент), Туркменістан (Ашхабад), Таджыкістан (Душанбэ), Кыргызстан (Бішкек), Грузія (Тбілісі), Арменія (Ерэван), Азербайджан (Баку), ЗША (Вашынгтон, Нью-Ёрк, ЛосАнджэлес), Канада (Атава, Манрэаль, Таронта), Мексіка (Мехіка), Бразілія (Бразіліа, Сан-Паўлу, Рыа-дэ-Жанейра), Аргенціна (БуэнасАйрэс), Чылі (Сант'яга), Калумбія (Багата), Перу (Ліма), Егіпет (Каір, Александрыя), Алжыр (Алжыр), Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка (Прэторыя, Ёханэсбург, Кейптаўн), Нігерыя (Лагос), Аўстралійскі Саюз (Канбера, Сіднэй, Мельбурн), Новая Зеландыя (Велінгтон).

Асноўныя цэнтры прамысловасці свету: «Прамысловы трохвугольнік» Італіі (Турын – Генуя – Мілан).

Фінансавыя цэнтры свету: Лондан, Нью-Ёрк, Ганконг.

Краіны, якія лідзіруюць у развіцці міжнароднага турызму: Францыя, Іспанія, ЗША.

Вядучыя дзяржавы па колькасці турысцкіх прыбыццяў: Францыя, Іспанія, ЗША.

Найбуйнейшыя транснацыянальныя карпарацыі (ТНК) свету: Walmart (ЗША), State Grid (Кітай), Saudi Aramco (Саудаўская Аравія).

Вядучыя інтэграцыйныя аб'яднанні свету: Еўрапейскі саюз (ЕС), Пагадненне Злучаных Штатаў, Мексікі і Канады (The United States – Mexico – Canada Agreement (USMCA), агульны рынак краін Паўднёвай Амерыкі (МЕРКОСУР), БРІКС (BRICS – скарачэнне ад Brazil, Russia, India, China, South Africa).

Вядучыя краіны па развіцці інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій (ІКТ): Ісландыя, Рэспубліка Карэя, Швейцарыя.

Краіны свету рэсурсазбыткоўныя (Канада, Аўстралія, Расія), рэсурсазабяспечаныя (ЗША, Кітай, Бразілія), рэсурсадэфіцытныя (Японія, Рэспубліка Карэя, Італія).

Рэгіянальныя канфлікты (араба-ізраільскі, інда-пакістанскі, карэйскі, тайваньскі).

Найбуйнейшыя прамысловыя цэнтры Беларусі. Гарады, якія з'яўляюцца абласнымі цэнтрамі, найбуйнейшымі транспартнымі вузламі, а таксама гарады, у якіх знаходзяцца ўстановы вышэйшай адукацыі (універсітэты, акадэміі, інстытуты). Гарады Беларусі: Брэст, Баранавічы, Пінск, Віцебск, Наваполацк, Полацк, Орша, Гомель, Мазыр, Гродна, Ліда, Магілёў, Бабруйск, Мінск, Барысаў, Салігорск, Маладзечна, Жодзіна, Мінская агламерацыя.

Свабодныя эканамічныя зоны Беларусі: «Мінск», «Гомель-Ратон», «Віцебск», «Магілёў», «Гроднаінвест», «Брэст».

Радовішчы карысных выкапняў: нафты – Рэчыцкае, Асташкавіцкае; калійных солей – Старобінскае, Петрыкаўскае; каменнай солі – Мазырскае; даламітаў – Руба.

Металургічныя базы: Уральская, Цэнтральная, Сібірская; цэнтр каляровай металургіі – Нарыльск.

Машынабудаўнічыя цэнтры: аўтамабілебудаванне – Ніжні Ноўгарад, Тальяці, Набярэжныя Чаўны, авіяцыйная прамысловасць – Казань.

Транспарт: Транссібірская чыгуначная магістраль. Порты: Наварасійск, Калінінград, Мурманск.

## СПІС РЭКАМЕНДАВАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Атлас. Геаграфія. Фізічная геаграфія : вучэб. дапам. для 6 кл. установ агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А. Г. Кальмакова, В. У. Пікулік. – Мінск : РУП «Белкартаграфія», 2023.

2. Атлас. Геаграфія. Мацерыкі і акіяны : вучэб. дапам. для 7 кл. установ агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А. Г. Кальмакова, П. С. Лопух, В. У. Сарычава. – Мінск : РУП «Белкартаграфія», 2025.

3. Атлас. Геаграфія. Краіны і народы : вучэб. дапам. для 8 кл. установ агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / Г. З. Озем, Л. Р. Альгамец, Л. У. Факеева, Л. В. Шкель. – Мінск : РУП «Белкартаграфія», 2019.

4. Атлас. Геаграфія Беларусі : вучэб. дапам. для 9 кл. установ агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / навуковыя рэдактары : К. А. Анціпава, М. М. Брылеўскі, П. С. Лопух. – Мінск: РУП «Белкартаграфія», 2024.

5. Атлас. Геаграфія. Сусветная гаспадарка і глабальныя праблемы чалавецтва : вучэб. дапам. для 11 кл. установ агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А. М. Вітчанка, К. А. Анціпава. – Мінск: РУП «Белкартаграфія», 2018.

6. Геаграфія. Фізічная геаграфія: вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А. Г. Кальмакова, В. У. Пікулік. – Мінск : Народная асвета, 2022.

7. Геаграфія. Мацерыкі і акіяны: вучэб. дапам. для 7-га класа устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А. Г. Кальмакова, П. С. Лопух, В. У. Сарычава. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2023.

8. Геаграфія. Краіны і народы : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / П. С. Лопух, М. Л. Страха, В. У. Сарычава, А. Г. Шандроха. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2019.

9. Геаграфія Беларусі : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / М. М. Брылеўскі, А. У. Клімовіч. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2025.

10. Геаграфія. Сацыяльна-эканамічная геаграфія свету : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / К. А. Анціпава, В. М. Гузава. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2019.

11. Геаграфія. Глабальныя праблемы чалавецтва : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / А. М. Вітчанка, К. А. Анціпава, В. М. Гузава. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2021.